Шыфр:________________________
Колькасць балаў:__________________________

Месца:_____________________________

УТВЕРЖДАЮ
Начальник главного управления образования Гродненского облисполкома
Р.Ю.Абрамчик
15.04.2026

# Абласная алімпіяда школьнікаў па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”
## Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры
## VIII клас

| **Заданні** | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** | **8** | **9** | **10** | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

***Гродна, 2026 г.***

*Шаноўныя ўдзельнікі алімпіяды, на выкананне заданняў адводзіцца 3(тры) гадзіны, максімальная колькасць балаў – 55. Поспехаў у працы!*

**Заданне 1.** Адзначце фанетычныя з’явы, якія адлюстраваны ў прапанаваных словах. Запоўніце табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| Слова | Фанетычныя з’ява |
|---|---|
| Смех | |
| Параход | |
| Касьба | |
| Перапісчык | |
| Дзядуля | |

**Заданне 2.** Сёлета адзначаецца 90-годдзе з дня нараджэння вядомага беларускага паэта Янкі Сіпакова. У Год беларускай жанчыны прапануем вам азнаёміцца з першым санетам, які ўвайшоў у вянок санетаў “Жанчына”. Аднак, пры падрыхтоўцы да друку высветлілася, што займеннікі *сябе, ты* запісаны не ў тым склоне. Папрацуйце, калі ласка, рэдактарамі і выпраўце тэкст. Вызначце і запішыце склон займенніка.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

Ад рук, ад вуснаў, ад вачэй тваіх
Пачаўся свет – ласкавы і пакорны.
А што было, скажыце мне, да іх
У заінелай з нелюбі прасторы?

Як грэліся б ад позіркаў цяжкіх
Мужчыны у сваім мужчынскім горы,
Калі б *ты* не выснілі вякі – ________________________________
*Ты*, што гэтак шчодра ўсіх адорыць. ________________________

Прыйшла *ты* – кветкі выраслі ля хат, ________________________
І гнёзды нараджалі птушанят,
І цёпла стала ўсюды, нібы ў леце.

Мужчына усміхнуўся сам *сябе*, ____________________________
Бо зразумеў, самотны, – за *ты* ____________________________
Няма нічога ласкавей на свеце!

**Заданне 3.** У беларускай мове, як і ў многіх іншых, ёсць словы, пераклад якіх на іншую мову немагчыма зрабіць адным словам. Такія словы адносяцца да безэквівалентнай лексікі. Перакладзіце адным словам на беларускую мову паняцці з рускай мовы.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| **Паняцце на рускай мове** | **Адпаведнік на беларускай мове** |
|---|---|
| По обе стороны чего-либо | |
| Вербное воскресенье | |
| В прошлом году | |
| Коллективная помощь, работа сообща | |
| Летучая мышь | |

**Заданне 4.** Запоўніце табліцу, размяркуйце словы згодна марфемнай структуры.
Анатомія, аптэкар, ардынатар, балюча, загіпсаваць, зажывіць, лекавы, лекарскі, медыцынскі, хірургічна.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| ***Марфемная будова*** | ***Слова*** |
|---|---|
| Корань, суфікс, канчатак | |
| Корань, суфікс, нулявы канчатак | |
| Прыстаўка, корань, суфікс, суфікс, суфікс | |
| Корань, суфікс, суфікс | |
| Корань, суфікс, суфікс, канчатак | |

**Заданне 5.** Вызначце, якімі спосабамі ўтвораны словы. Запоўніце табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

| *Слова* | *Слова(ы) ад якога ўтвораны* | *Спосаб утварэння* |
|---|---|---|
| урасцяжку | | |
| узмежжа | | |
| футбаліст | | |
| фізпадрыхтоўка | | |

**Заданне 6.** Сёлета спаўняецца 205 гадоў з дня нараджэння сусветна вядомага пісьменніка Фёдара Дастаеўскага, продкі якога паходзяць з Беларусі. Перакладзіце, прапанавны тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – 10.*

Ф.М. Достоевский и Достоево

Достоево – это деревня Ивановского района Брестской области. Она известна всем любителям и знатокам русской литературы тем, что здесь располагалось имение предков великого русского писателя Фёдора Михайловича Достоевского. В местной школе открыт Народный литературно-краеведческий музей имени Фёдора Достоевского, где в фондах хранятся уникальные предметы. В 1996 году во дворе школы установлен памятник Ф.Достоевскому. Доподлинно известно, что сам писатель никогда не был в Достоево, а вот его правнук Дмитрий Андреевич Достоевский в 2007 году посетил родину предков.

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

**Заданне 7.** Ва ўсіх прапанаваных сказах пэўнае слова (словы, спалучэнні слоў) адасабляюцца, на пісьме аддзяляюцца (выдзяляюцца) знакамі прыпынку. Але ў кожнай з трох груп ёсць адзін лішні сказ з улікам адасобленага кампанента. Напішыце нумар гэтага сказа і патлумачце, па якой прычыне ён з’яўляецца лішнім.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| | |
|---|---|
| 1. Здароў, марозны звонкі вечар, здароў, скрыпучы, мяккі снег!<br>2. Люблю цябе, мой бераг родны, дзе льецца Нёман срэбназвонны.<br>3. Можа, яшчэ хто з іх прыйдзе дамоў, каб паглядзець на прасторы палёў. | |
| 1. Хведзька, прысеўшы наўколенцы, штосьці зацікаўлена разглядаў у траве.<br>2. Як мары, белыя бярозы пад сінявой начной стаяць.<br>3. Як тая рабіна, цвіла ў гэтае лета Ганна. | |
| 1. Кончыўшы ўпоцемку малаціць, Васіль павесіў на шула цэп і выйшаў з гумна.<br>2. Пот мачыў цвёрдыя, двух колераў валасы, поўз на лоб, абпалены сонцам.<br>3. Уваткнуўшы канец касся ў мяккую зямлю, Васіль стаў мянташыць. | |

**Заданне 8.** Размяркуйце фразеалагізмы па групах, вызначыўшы іх значэнне.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

Абуваць у лапці, капля ў моры, на злом галавы, на макавае зерне, па самую завязку, пераліваць з пустога ў парожняе, плесці кашалі з лапцямі, прадаць і грошы палічыць, хоць вазамі вазі, як з ланцуга сарваўшыся.

| **Значэнне фразеалагізма** | **Фразеалагізм** |
|---|---|
| спрытна, хітра ашукаць, падмануць | 1.<br>2. |
| пустасловіць, гаварыць упустую | 1.<br>2. |
| вельмі (празмерна) хутка | 1.<br>2. |
| вельмі многа | 1.<br>2. |
| вельмі мала | 1.<br>2. |

**Заданне 9.** Па апісаннях, прыведзеных у табліцы, вызначце твор, запішыце яго назву, аўтара і жанр.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| **Інфармацыя пра твор** | **Назва твора** | **Аўтар** | **Жанр** |
|---|---|---|---|
| Твор выразна дзеліцца на дзве супрацьлеглыя часткі і своеасаблівае падагульненне, вывад. З першых слоў у творы непрымірыма сутыкнулася сваё, роднае з чужым, панскім. | | Максім Багдановіч | |
| У гэтым творы, выкарыстоўваючы алегорыю, аўтар вельмі ўдала апісвае пэўныя заганы (невуцтва, ганарлівасць, разумовую абмежаванасць, упартасць) чалавека, якога ў народзе часта называюць бараном. | | | Байка |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Уся аповесць складаецца з “біяграфій” персанажаў, узятых у агульную рамку вайны, блізкага бою, чакання немінучай пагібелі. Гэта “рамка” якраз і надае значнасць усяму, што калісьці было з чалавекам і што ёсць, выяўляючы вялікае або нікчэмнае ў ім. | | | Аповесць |
| У творы праз сутыкненне гусляра і князя паказваецца сіла і непадкупнасць народнага мастацтва. | | Янка Купала | |
| Вуліца сучаснай неперспектыўнай вёскі. Хата, яе фасад. Пад вокнамі лавачка. Злева, каля плота, стары рыпучы журавель. На адным яго канцы ледзь пагойдваецца абшарпанае драўлянае вядро, на другім – груз. | | | Драма |

**Заданне 10.** Разгадайце крыжаванку, успомніўшы тэарэтычныя літаратурныя паняцці. Гэта дапаможа вам назваць сапраўднае прозвішча (па вертыкалі) вядомай беларускай пісьменніцы, чыё 150-годдзе з дня нараджэння адзначаецца сёлета.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

1. Малюнак прыроды ў літаратурным творы.
2. Разгорнутае выказванне адной асобы ў мастацкім творы.
3. Невялікі літаратурны твор, напісаны рытмічнай мовай.
4. Урачыста-жалобны літаратурны або музычны твор, прысвечаны памяці загінуўшых.
5. Дзейная асоба, персанаж, вобраз чалавека ў творы.
6. Умоўнае абазначэнне думкі, ідэі, перажывання, з’явы праз мастацкі вобраз, які нечым нагадвае іх.
7. Мастацкае азначэнне, якое вобразна характарызуе з’яву, прадмет, чалавека.
8. Устойлівая форма, з якой пачынаецца казка.

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | | | | | |
| 2 | | | | | | | | |
| 3 | | | | | | | | |
| | 4 | | | | | | | |
| | | 5 | | | | | | |
| 6 | | | | | | | | |
| | 7 | | | | | | | |
| | 8 | | | | | | | |

Запішыце: а) найбольш вядомы псеўданім пісьменніцы______________
_____________________________________________________________

б) назву твора, які разглядалі ў VII класе _________________________
_____________________________________________________________